но стрелки, герои взвода,
с ним готовы за Донец,
а за ним – в огонь и воду.
Там в часы разведок,
огневых налетов,
что сбивают ветки
пулями полетов
и в пути-дороге,
длинном для пехоты
не было тревоги,
унывать охоты.
В час жестокой схватки
ищешь друга взглядом,
после боя, в плащпалатке,
жизни друга рады.
Мы взломали оборону,
перешли Донец;
немало понесли урону
и друзей сразил свинец.
Нелегко и мне пришлось:
стали клок ударил в грудь;
заменить, кому нашлось,
без заминки рота – в путь.
Положив на плащ-палатку,
за четыре взяв конца,
вынесли из смертной
схватки
«старики» – юнца...
29.11.1945г. г.Тавда.

На марше

В пыльном пути,
на марше-походе,
друга найти
можно в пехоте.
Перенестись к дому,
на привале, мигом,
к полю родному,
полянам и ригам...
Комбат оборвал:
«Внимание! Встать!»
– кончен привал,
в дорогу опять.
Немея от груза,
потеет спина,
да разве обуза
– винтовка одна?
Приходится туго,
но слабости – прочь,
винтовку у друга
возьмешь, чтоб помочь.
Друг веселеет,
он помощи рад;
«Привал бы скорее»,
– мечтает солдат.
Котелок о лопатку
мерно стучит,
в жаркую схватку
тоже спешит.
Обочиной пыльной
проходим поля,
травою обильной
покрылась земля.
В сумерках дня
вздохи зениток
и вспышки огня
светящихся «ниток».
Дымною тучей
покрыт горизонт;
грохот могучий
и слышится – «Фронт!»
Зашли мы в лесок
– с овчинку весь мир;
кругом сосны, песок.
Подошел командир –
наш, отдал ему честь;
мелкий дождь моросил;
«Отставшие есть?» –
подполковник спросил.
В круг разрывов кольцо,
взгляд солдат напряжен.
– «Люди все налицо.
В бой готов батальон».
Март, 1946г. г.Тавда.

Беларусь

От сердца песню спою,
когда до тебя доберусь,
а сейчас, в далеком краю
вспоминаю мою Беларусь.
По Припяти челн спокойно плывет,
в затонах вода в нерушимом покое;
в Ламочах бакенщик Федор живет
– там все родное такое.
Вербы дремотно стоят над рекой,
в почках еще их волшебный убор,
за лугом, который зарос осокой,
родные поляны, исхоженный бор.
Помню, гнезда я в нем разорял,
с высокого дуба чуть не свалился,
из гнезда коршунов яйца достал
и ими потом бесконечно гордился.
Я вспоминаю с грустью теперь
то, что было когда-то.
Много бед натворил
там двуногий зверь
наряженный в фашистскую
форму солдата.
Давно я не был в том краю,
враг искалечил поля и тот бор,
сжег с людьми деревню мою,
изрыл траншеями памятный двор.
Давно я не видел эти руины,
но мстил за разор, стреляя в упор,
по врагам среди балок и рощ Украины
за родные деревни, поляны и бор.
Я с фронта приехал на древний Урал,
врагов на нашей земле не осталось,
расцветает земля, я еще не видал,
что с тобой, Беларусь моя, сталось.
Я песню от сердца спою,
когда до тебя доберусь,
а сейчас, в далеком краю,
вспоминаю мою Беларусь.
Апрель, 1946 г. г.Тавда.

СВЯТА

Дзень болю і радасці

Ваенны парад у Мінску пачнецца 9 Мая ў 11 гадзін раніцы, хаця раней меркавалася, што парад будзе праводзіцца ўвечары.

На прэс-канферэнцыі ў Мінску прэс-сакратар Мінабароны Уладзімір Макараў паведаміў, што парад працягнецца адну гадзіну. У ім прымуць удзел каля 5 тысяч вайскоўцаў, больш за 250 адзінак тэхнікі, 40 самалётаў і верталётаў.

Расію будуць прадстаўляць 170 вайскоўцаў 234-га гвардзейскага Чарнаморскага дэсантнага палка. Першай будзе ісці тэхніка часоў вайны. У калоне будуць ісці танкі Т-38, Т-34, Т-44, цяжкія танкі ІС-2, ІС-3 і лёгкі танк БТ-7, устаноўкі СУ-100 і СУ-152, БМ-13 ("кацюша"), зенітна-ракетныя комплексы, артылерыйскія ўстаноўкі і рэактыўныя сістэмы залпавага агню.

Ад Беларусі будуць: Т-72б, БМП-2, беларуская РСЗА "Белград", "Смерч", ЗРК С-300ПС і С-300В, ЗРК ТОР-М2, ракетныя комплексы "Точка" і аўтамабіль "Багатыр". Будуць таксама расійскія танкі Т-90, БТР-82 і "Тыгры".

У неба падымуцца беларускія МІ-8, МІ-24, МІГ-29, СУ-25 ІЛ-76 і група "Белая Русь" на самалётах Л-39. А таксама расійскія ЯК-130, СУ-34, ТУ-22Н і ТУ-95.

Нечаканасцю сёлетняга парада стане тое, што ў ім прымуць удзел амерыканскія вайскоўцы – аркестр ваенна-паветраных сіл.

Агулам па Мінску 9 Мая пройдзе больш за 70 мерапрыемстваў. Святочны салют пачнецца ў 22 гадзіны і будзе складацца з 20 залпаў. У Мінску будзе 6 кропак – у парку імя 50-годдзя Перамогі, на пустцы недалёка ад вуліцы Прыгорнай, на тэрыторыі аэрапорта Мінск-1, у раёне Чыжоўскіх могілак, на паўночна-заходнім беразе вадасховішча Дразды і ў ваенным гарадку ва Уруччы.

Нагадваем, што на асноўных пляцоўках святкавання 70-годдзя Перамогі будуць працаваць прапускныя пункты. Хоць летась іх колькасць павялічылі на 30%, мінская міліцыя раіць прыходзіць загадзя і не мець забароненых прадметаў, каб хутчэй прайсці дагляд.

БОЛЬ

Слезы на глазах

Приближается День Победы – «праздник со слезами на глазах». Эти слезы – не только от ощущения гордости за ту великую победу, но и от горечи: многонациональный народ перенес все ужасы той войны со страшными потерями. И еще печаль от того, что победители уже в мирное время оказались на более низком социальном уровне, чем побежденные.

Почему произошла такая метаморфоза? Абсолютное большинство ветеранов войны, доживших до нынешних времен, были и ветеранами труда. На их плечи легло и восстановление разрушенной страны. Они трудились на ее благо с надеждой на лучшее будущее, а остались... у разбитого корыта, многократно обманутые, обворованные, в бесправии и бедности. То, что было заработано их ратным трудом уже в мирные годы, было отнято. Слезы на глазах от того, что отняли у них их кровные, и произошло это уже в свободной Беларуси.

Как кощунство, как насмешка, ставшее притчей во языцех стремительное возведение помпезных фешенебельных резиденций, гостиничных комплексов, ледовых дворцов, которые вряд ли когда-нибудь себя окупят. Таких, например, как барановичский ледовый дворец. Было бы гораздо полезней, если бы такие большие деньги пошли на улучшение быта барановичских ветеранов войны и труда.

С государственной дотацией проводятся различные дорогостоящие фестивали с приглашением гастролирующих исполнителей за огромные гонорары. И за чей это счет? Не за те ли деньги, что отняты у ветеранов? Плакать хочется, что не хватает средств для улучшения их быта, на льготные лекарства, на льготный проезд в общественном транспорте, которыми пользуются ветераны в странах-соседях.

Страна залезает в долги, которые все увеличиваются и увеличиваются. Так что вряд ли дождутся ветераны, чтобы государство их отблагодарило, рассчиталось с ними.

Позабыты и дети войны, уже нынешние ветераны труда (многие из которых являются бывшими воспитанниками детских домов), начавшие свою трудовую жизнь в 13–14 лет, не познавшие счастливого детства.

Что и говорить, «хороший» пример для подрастающего поколения. Где гарантия, что и это поколение, как поколение ветеранов, не будет в будущем обмануто и обобрано?

Ольга Ивановна ВАРАКСА, Александр Эдуардович ВАРАКСА, ветераны труда, бывшие воспитанники детских домов.

Минск.

Дзеці таксама «кавалі» Перамогу!

Цалкам падтрымліваю прапанову Руслана Гарбачова аб прадастаўленні льгот для "дзяцей вайны" ("НВ", 10.04.2015 г.).

Па-першае, вайна прыпыніла вучобу многіх школьнікаў. Напрыклад, я пайшоў у першы клас у няпоўных шэсць год у 1941 годзе. У снежні нам аб'явілі нібыта канікулы, а на самай справе партызаны далі загад закрыць школу.

Пасля вызвалення Беларусі я не адразу змог прадоўжыць вучобу, бо будынак школы спалілі партызаны, каб немцам не было дзе размясціць пастарунак, а гітлераўцы, каб адпомсціць, знішчылі наша паселішча.

На досвітку таго "чорнага" дня "эстафета" грамадзянскага каравула перадала нам, што з райцэнтра выехала калона карнікаў і яны па грэблі рухаюцца ў наш бок. Мы паспелі ўцячы за Днепра-Бугскі канал у партызанскую зону, забраўшы з сабою шэсць кароў, кабылу і каня з возам, на які пагрузілі харчы, усё адзенне і абутак. Гэты воз быў прыгатаваны да эвакуацыі яшчэ з восені.

Вярнуліся мы на сваё пажарышча пасля вызвалення з адной кароўкай, а з адзення і абутку засталося толькі тое, што было на нас. Таму ў 1944 годзе я не змог пайсці ў школу за пяць кіламетраў, бо не было ў што апранууца і абуцца. Мы нават не мелі бялізны на змену. Летам маці вяла нас, сыноў, у маладыя зараслі сліў, там мы здымалі бялізну і голыя сядзелі, пакуль яна не памые і не пасушыць яе на сонейку. Сёстры сядзелі ў зараслях вішняка. З наступленнем восені гэты працэс ускладняўся тым, што бялізна доўга сохла над печчу.

Па-другое, у партызанскай зоне ўся дзетвара школьнага ўзросту таксама працавала на Перамогу: пасвілі табуны партызанскіх кароў і коней, зімою без канца ўручную вілі (круцілі) тонкія і доўгія вяроўкі (шнуры) для партызан-падрыўнікоў цягнікоў, а па лясах вялі нарыхтоўку дроў і выконвалі іншыя заданні. Дзяўчаты вязалі з суконных нітак шкарпэткі і панчохі, шылі бялізну з палатна ўручную ці на швейных машынках. У Заходняй Беларусі ў многіх сем'ях былі такія машынкі.

А колькі дзяцей загінула і пакалечылася на мінах, пастаўленых партызанамі ці немцамі! Не мінула гэта бяда і мяне з старэйшым братам і малодшай сястрой. Вясной 1944 года мы падарваліся. Мусіць, міна была нямецкая, бо гэта з намі здарылася недалёка ад папялішча, спаленага партызанамі нямецкага пастарунка. З-за ранення брат быў прызнаны нягодным да вайсковай службы ў мірны час. У мяне таксама былі праблемы з параненай нагой, але я на медыцынскай камісіі ў ваенкамаце не прызнаўся, што быў паранены. Бо мне хацелася, каб прызналі годным да ваеннай службы. Я марыў пасля школы паступіць ў ваеннае вучылішча.

Вось якія пакуты прынесла нам гэтая праклятая вайна і пазбавіла нас шчаслівага дзяцінства. Але мы, "дзеці вайны", як маглі дапамагалі партызанам шкодзіць фашыстам і набліжаць дзень Перамогі.

Пасля вызвалення Беларусі дапамагалі бацькам будаваць жыллё і аднаўляць сельскую гаспадарку, а вечарамі маці з сястрой вязалі цёплыя шкарпэткі і панчохі для адпраўкі на фронт.

А колькі розных пакут перанеслі мы, дзеці, за гады вайны, уцякаючы ад немцаў ці мадзяр па топкіх балотах і начуючы ў лясах пад елкамі ці хвоямі! Таму пасля вызвалення яшчэ шмат год хварэлі ад праступ і іншых няўзгод.

Даўно трэба было больш настойліва дамагацца льгот нам самім, а для гэтага мусіць трэба стварыць Рэспубліканскую арганізацыю "Дзеці вайны". Запрашаю на старонках газеты "Народная Воля" абмеркаваць, як нам лепей дамагчыся якой-небудзь падтрымкі ад дзяржавы, бо існуем па прынцыпу: данашваем, даядаем, дажываем.

Неяк я палічыў, колькі магу купіць прадуктаў на сваю пенсію, то атрымалася, што значна менш, чым на стыпендыю на пятым курсе. Дык тады ж мне не трэба было купляць лекі і траціць грошы на паездкі на дачу і на гасцінцы ўнукам і ўнучкам. Прыходзіцца яшчэ працаваць, а за гэта зніжаюць нам пенсіі. Нібы мы шкоду робім.

Як бачыце, не тых мы дэпутатаў абралі і не тую ўладу, бо яны зусім не дбаюць пра нас.

Расціслаў ВАШКЕВІЧ, мінчанін.

P.S. Прабачце, што высылаю рукапіс, бо няма машынак з беларускім алфавітам, а камп'ютар я яшчэ не асвоіў, ды і дарагі ён. Ёсць службы, якія друкуюць, але ж яны бяруць 60.000 рублёў за адну старонку тэкста.

ДАЛЁКАЕ-БЛІЗКАЕ

На валасок ад смерці

У пяцідзясятых я вучыўся на вячэрнім аддзяленні аднаго з мінскіх тэхнікумаў. Аднойчы перад сканчэннем заняткаў мы папрасілі выкладчыка (які неяк абмовіўся пра сваю службу на заходняй мяжы ваенным інжынерам-будаўніком) расказаць пра які-небудзь эпізод з часоў вайны, калі яму прыйшлося перажыць вельмі цяжкія хвіліны і здавалася, што жыццю прыйшоў канец.

І вось што ён распавёў. Пераказваю, як памятаю, ад першай асобы.

"Аднойчы, яшчэ ў 1940 годзе, мяне тэрмінова запатрабаваў да сябе начальнік гарнізона. Ён паведаміў, што прыйшла дэпеша з міністэрства, каб я тэрмінова прыбыў з рэчамі, і што квіток ужо замоўлены ў чыгуначнай касе. Мне выдалі суправаджальныя дакументы і пажадалі добрай дарогі.

Раніцай я прыбыў у Мінск. Усю ноч не спаў, у галаву лезлі самыя цяжкія думкі, і адна з іх – ці я сам паеду на новае месца прызначэння ў пасажырскім вагоне, ці мяне павязуць у "цялятніку".

Рэчы я здаў у камеру захоўвання і адправіўся па адрасе, пазначаным у паперах.

Была раніца. Працоўны дзень толькі пачынаўся. Па дарозе я вырашыў, што трэба было б паснедаць – можа, гэта будзе мой апошні снядананак на волі. Зайшоў у рэстаран, зрабіў заказ і да яго сто грамаў гарэлкі. Будзь што будзе, вырашыў я.

Працэдура праверкі дакументаў была нядоўгай; мне растлумачылі, дзе знаходзіцца прыёмная міністра, і далі суправаджальніка. Міністру далажылі аб маім прыбыцці, і мяне запрасілі да яго.

Я ўвайшоў, далажыў і аддаў свае дакументы, а сам знаходзіўся пад вялікім страхам.

Міністр паглядзеў на мяне ўважліва, нібы вывучаў, быццам прынюхваўся, – і раптам сказаў:

– Уф-ф-ф! Вы ж ішлі на прыём да міністра, маглі ж выпіць каньяку, а не гарэлкі!

Ад такіх слоў у мяне нібы гара звалілася з плеч.

Міністр, напэўна, здагадваўся пра мае адчуванні і пачаў весці размову так, каб я супакоіўся. Ён запрасіў мяне сесці, распытаў трохі пра мяне, пра тое, хто застаўся дома, як працавалася на старым месцы, і нарэшце сказаў: "Цяпер паедзеце ў Прыбалтыку, там работы непачаты край, і ўсё ж трэба пачынаць. Часы неспакойныя, трэба зрабіць усё магчымае". Пажадаў мне поспеху, і я паехаў на новае месца.

Вайсковая часць размяшчалася каля невялікага гарадка, і некаторых ваенных спецыялістаў, у тым ліку і мяне, пасялілі ў мясцовых жыхароў, лаяльных да нас. Мне далі пакой. Гаспадару было гадоў пад пяцьдзясят: спакойны, дабрадушны, заўсёды пытаўся, ці не трэба мне чым дапамагчы...

Час ішоў, пастаўленыя перад намі задачы выконваліся. Скончылася зіма, прайшла вясна, і надышло цудоўнае балтыйскае лета.

Аднойчы раніцай я праз сон пачуў рыпенне дзвярэй. Расплюшчыўшы вочы, убачыў, што праз парог ціха пераступае і ўваходзіць у пакой гаспадар. З сякерай. За ім – ягоны сын. З віламі. Яны даходзяць да сярэдзіны пакоя, спыняюцца. Да майго ложка – два крокі.

"Гэта па мяне. Гэта мая смерць", – падумаў я.

У мяне пад падушкай ляжыць пісталет. Думкі аб выратаванні мітусяцца ў галаве, а я прыкідваюся, што сплю. А ім ці то няёмка, ці то нецікава забіваць спячага. Каб мяне разбудзіць, напэўна, гаспадар гаворыць: "Ну, дзякуй Богу, нашы прыйшлі!" – і робіць яшчэ адзін крок да ложка...

І ў гэты момант дзверы з грукатам расчыняюцца і ў пакой убягае чырвонаармеец с вінтоўкай. Я выхопліваю з-пад падушкі пісталет. Гаспадар з сынам хутка пакідаюць пакой...

Гэта было 22 чэрвеня 1941 года. Так пачалася для мяне вайна", – скончыў свой аповед наш выкладчык.

Дзень Перамогі

Дзень быў сонечны і цёплы, і недзе апоўдні прыйшла гэтая вестка, такая радасная і доўгачаканая. Адкуль яна прыйшла – з раёна ці з сельсавета – і хто яе прынес, не памятаю, але яна імгненна разнеслася па вёсцы. "Перамога! Вайна скончылася!"

Жыхары нашай вёскі Здудзічы Парыцкага раёна Гомельскай вобласці выходзілі на вуліцу і не ведалі, верыць ці не. Але вось ідзе калгасны брыгадзір і ўсім кажа, каб ішлі на мітынг, які зараз пачнецца насупраць двара Адар'і. Там і сталі збірацца жыхары вёскі.

Прынеслі ад кагосьці стол і лаўку. Стол накрылі чыстым белым абрусам; на яго падняўся старшыня калгаса. Ён урачыста павіншаваў усіх з перамогай, выказаў спачуванні сем'ям загінуўшых, сказаў, што трэба ўсім яшчэ мацней аб'яднацца вакол партыі і пачаць адбудоўваць краіну, а ўлада будзе аказваць у гэтым неабходную дапамогу.

Пасля старшыні на стол падымаліся дэмабілізаваныя з арміі па ўзросце ці пасля раненняў. Яны ўзгадвалі пра цяжкія баі і загінуўшых сяброў. Людзі слухалі, некаторыя жанчыны плакалі, а некаторыя стаялі моўчкі, бо не было чым плакаць – усе слёзы ўжо выплаканы з моманту атрымання "пахавальнай".

Але тым не менш агульны настрой быў радасны, бо ўсе ведалі: хутка з фронту пачнуць вяртацца блізкія, суседзі... Чакалі не толькі з арміі. Спадзяваліся, што з Перамогай будзе аб'яўлена амністыя і што з турмаў і лагераў вызваляць тых, хто трапіў пад "хапун".

А яшчэ хадзілі легенды, што, калі біліся пад Масквой, дык нібыта Сталін звярнуўся да народа з абяцаннем, што як адстаім сталіцу, разаб'ём немцаў, дык тады будуць распушчаны калгасы. "І ўдарылі пушкі, і паляцелі самалёты, і пайшлі танкі, а за імі ўсе, хто толькі мог трымаць зброю. Вораг быў разбіты і адкінуты далёка", – так у нас тады распавядалі. Калі я быў ужо дарослым, пытаўся іншым разам у франтавікоў наконт гэтай легенды. Але ніхто не чуў пра яе...

Мітынг скончыўся. Людзі разышліся па сваіх падворках – жыць чаканнем, што хутка стануць вяртацца родныя, блізкія і знаёмыя – і з захаду, і з усходу. Але вярталіся толькі з захаду.

З нашага роду на фронце ваяваў брат Мікалай і дзядзька Ілля. А рэпрэсаваны былі дзядзька Іван і мой бацька Рыгор.

Вярнуўся дахаты ў 1947 годзе толькі брат Мікалай.

Леанід БАСТУНЕЦ, жыхар Мінска.

З-ЗА КРАТАЎ

Без права на амністыю

Зняволенаму праваабаронцу Андрэю Бандарэнку вынесена ўжо трэцяе папярэджанне. Такім чынам ён стаў злосным парушальнікам і страціў права на амністыю.

Праваабаронца зараз адбывае пакаранне ў шклоўскай калоніі №17. Ён быў пераведзены ў памяшканне камернага тыпу, у адзіночную камеру на паўгода. Паводле слоў кіраўніка „Праваабарончага альянсу" Людмілы Гразновай, сітуацыя з Бандарэнкам ускладняецца тым, што праваабарончыя арганізацыі не прызнаюць яго палітзняволеным. Асуджаны ён па артыкуле хуліганства на 4 гады зняволення. Адзін год быў зняты судом па амністыі.

– Трэба дамагацца прызнання Андрэя Бандарэнкі палітвязнем, паколькі тое пакаранне, якое да яго прымянілі, не адпавядае той правіне, якую ён здзейсніў. Каб ён быў звычайным чалавекам, за зробленае ён атрымаў бы 15 сутак альбо штраф. Але паколькі ён праваабаронца, які займаўся такой складанай праблемай, як турмы і калоніі, то яго пакаралі абсалютна не па законе, – лічыць Людміла Гразнова.

ЗАКУЛИСЬЕ

Что стоит за отзывом посла Украины из Беларуси?

О причинах отзыва посла Украины в Беларуси Михаила Ежеля рассказал известный украинский политический обозреватель Олександр Палий.

– Пока есть информация о том, что главные претензии к нему связаны с его пребыванием на посту министра обороны. По сути, нам нужно сейчас предъявлять претензии ко всем министрам обороны, потому что армия была разграблена.

– Что сыграло решающую роль в отставке Ежеля: обвинения в нанесении государству ущерба во время руководства Министерством обороны на сумму свыше 42 миллионов гривен или же другие мотивы?

– 42 миллиона гривен – это, очевидно, самая малость из того, что точно подтверждено.

– Разговоры об отставке украинского посла начались сразу после Майдана. Почему официальному Киеву понадобилось полтора года, чтобы инициировать отзыв посла?

– Думаю, его не убирали потому, что он хорошо работал с Александром Лукашенко, был с ним, так сказать, комплиментарным, это важно для дипломата.

– Новый посол должен быть патриотичным, профессиональным дипломатом, который сможет представлять интересы Украины в Беларуси. Учитывая особую политику официального Минска по отношению к Украине, какие еще качества должен иметь новый украинский посол? Кто может претендовать на эту должность?

– Новый посол должен в этом плане быть таким же – легко сработаться с руководством вашей страны, то есть – с одним человеком.

– Как повлияет смена посла на белорусско-украинские отношения? И повлияет ли вообще?

– Думаю, смена посла никак не повлияет на двусторонние отношения. Все равно политику определяют президенты. Посол – это только стиль и – в лучшем случае – контакты.

Алексей ЮРИЧ.

СУСЕДЗІ

Украіна ўзмацняе кантроль на мяжы з Беларуссю

У Чарнігаўскай вобласці, якая мяжуе з Беларуссю, узмоцнены дарожны кантроль. Увага надаецца найперш шашы Гомель–Чарнігаў. На трасе збудаваны дадатковы блок-пост, на якім кругласутачна дзяжурыць узброены міліцыянер, нацыянальныя гвардзейцы і актывісты з чарнігаўскай Самаабароны Майдана.

Пад пільны кантроль бяруцца аўтамабілі з расійскімі нумарамі, якія следуюць ва Украіну транзітам праз Беларусь. Яшчэ адзін накірунак кантролю – масты, чыгунка і вакзалы. Уся чарнігаўская міліцыя, а таксама СБУ пераведзены на ўзмоцнены рэжым работы – гэта робіцца з мэтай папярэджання правакацый і дыверсій. Паводле меркавання ўкраінскіх спецслужбоўцаў, правакацыі цалкам магчымы ў Чарнігаве на святкаванні Дня Перамогі.

ГОСТИНАЯ "НАРОДНОЙ ВОЛИ"



Бывший руководитель Национального банка в большом интервью «Народной Воле» рассказал, при каких обстоятельствах спасал страну от введения российского рубля, как себя вел в первые годы президентства Александр Лукашенко и в чем, на его взгляд, перспективы нашей страны.

Станислав БОГДАНКЕВИЧ:
«После официального приема Лукашенко и Ельцин танцевали...»

– Станислав Антонович, доводилось ли вам встречаться с Ельциным?

– Я неоднократно был в составе белорусских делегаций, которые вели переговоры с ним и его командой. И не только в Москве. К примеру, однажды попал в Минске на сабантуй, где Ельцин вытанцовывал.

– ?

– Проходил официальный прием. После него во время неформальной части Лукашенко и Ельцин танцевали.

– Правда ли, что в те годы Ельцин постоянно был под мухой?

– Не могу сказать, что постоянно. Но вот, помню, на совещании в Ташкенте ему что-то наливали из чайника, и рядом сидящие коллеги мне сказали, что это был не чай. К зданию, где мы вели переговоры, приблизилась толпа, выступавшая за открытие Исламского института. Ельцин пошел их успокаивать, охрана за ним. На улице его чуть помидорами не забросали, охрана потянула президента назад. Ельцин, конечно, не падал, но, чувствовалось, был нетрезв.

– Как сегодня к нему относитесь? Это ведь при нем началась поддержка режима Лукашенко.

– Я отдаю ему должное как человеку, который установил демократию в соседнем государстве. А то, что он поддерживал Лукашенко... Любой руководитель Российской Федерации будет поддерживать выгодного для себя лидера в небольшом соседнем государстве. Лукашенко выгоден России. Даже сейчас, когда он капризничает в связи с ситуацией в Украине. Помню, как-то беседовал с Гайдаром и Шохиным, они говорили: он, Лукашенко, хороший, предан России, никогда не пойдет на Запад, потому что ему там места нет.

– В апреле 1994 года в Москве белорусская правительственная делегация во главе с Кебичем подписала соглашение об объединении денежных систем Беларуси и России. Вы под документом сделали уточнение, что оно противоречит Конституции. Как проходили те переговоры?

– Надо иметь в виду, что когда мы с Кебичем и Мясниковичем летели в Москву, то у нас была единая позиция. Она состояла в том, что мы готовы подписать соглашение, если наш Нацбанк останется полностью независимым, т.е. подотчетным белорусскому парламенту и государству, а также что он будет иметь право выпускать общую с Россией валюту.

В Москве переговоры шли долго, часов двенадцать. Ельцин в то время был в Испании, поэтому делались перерывы, чтобы связываться с ним. Россия в итоге поняла, что самостоятельность нашего Нацбанка ей абсолютно невыгодна.

По нашему законодательству я был подотчетен не правительству, а Верховному Совету, поэтому моя подпись под этим соглашением была обязательна. И у меня были две причины, чтобы не утверждать этот документ. Первая: согласно нашим законам, Национальный банк не может стать филиалом банка другого государства. Вторая: на территории Беларуси единственным платежным средством является то, которое эмитируется Нацбанком. Поэтому я написал, что соглашение об объединении денежных систем противоречит белорусской Консти-туции.

– Получается, Кебич и Мясникович по ходу переговоров поменяли свою позицию?

– Когда они увидели, что Москва не пойдет на наши условия, они стали давить на меня, что надо пойти навстречу, что надо договориться о переходе на единую валюту. Я им возражал: мы же с вами договорились. Правда, еще до встречи в Москве я видел, что Кебич и Мясникович не понимали, что Россия никогда не пойдет на то, чтобы кто-то еще выпускал ее валюту. После развала СССР возникла ситуация, когда советский рубль могли выпускать в неограниченных количествах 12 бывших союзных республик (кроме стран Балтии). И я выпускал, условно, 10 миллиардов и платил ими, пустыми рублями, России за нефть. Это не только мы делали – то же самое делали Казахстан, Украина. Молдова. В общем, дурили Россию. Как они не могли понимать этого?.. Они увеличивали выпуск денег в три раза, а мы – в десять. Конечно, создавали таким образом инфляцию, но, что более важно, обеспечивали приток материальных ценностей в Беларусь.

Помню, еще Геращенко, глава Центрального банка России, убеждал меня: вот ты получаешь как глава белорусского Нацбанка, скажем, 100 долларов, а завтра как руководитель нашего филиала будешь иметь, например, 1000 – у нас все так получают. Но меня это не интересовало.

– Получается, что ваше вмешательство спасло Беларусь от введения российского рубля и как минимум утраты части суверенитета.

– Я прекрасно понимал, что своим уточнением заваливаю соглашение.

И Кебич это прекрасно понимал. Но он его подписал, потому что приближались президентские выборы, и ему хотелось сказать избирателю, что он добился вхождения в рублевую зону и что это спасет экономику Беларуси. Я же был убежден, что причина неэффективности нашей экономики не в названии валют, а в отсутствии рыночных подходов к развитию и что переход на российский рубль ставит под угрозу наши суверенитет и независимость.

– Кебич написал в книге воспоминаний: «Черномырдин рассказал мне, что российские спецслужбы перехватили секретный разговор Станислава Богданкевича со Станиславом Шушкевичем. Сначала согласившись на объединение валют, спикер затем категорически запретил это делать». Вы знали, что были под колпаком?

– Я не разговаривал с Шушкевичем! Никаких переговоров, встреч с Шушкевичем до полета на переговоры в Москву или по телефону из Москвы у меня не было. Я к Станиславу Станиславовичу хорошо относился и отношусь, считаю, что он был бы отличным президентом, который дал бы возможность профессионалам заниматься экономикой и не вмешивался бы в вопросы вроде тех, как доить коров, устанавливать валютный курс, лечить людей. Но не было у меня разговора с Шушкевичем! Не знаю, кто из них лгал: Кебич или Черномырдин. В книге Кебича, кстати, есть еще ряд неправдивых фактов.



Станислав Богданкевич и Станислав Шушкевич, 1999 год. Фото bymedia.net



Станислав Богданкевич на заседании Верховного Совета. Фото kp.ru

– Вы создали национальную валюту. А вам не обидно, что белорусские рубли прозвали «зайчиками»?

– Те «зайчики» не являлись продуктом Национального банка. Я не мог переубедить перейти на собственную валюту ни правительство Кебича, ни коммуно-аграрный, как я его называл, Верховный Совет. Все говорили: пропадем мы без рублевой зоны. А в итоге Россия ввела свой рубль, постановила не выдавать его ни одной республике бывшего Советского Союза, и мы оказались перед фактом отсутствия в стране наличных денег. Зарплату нечем было платить.

Но до этого правительство Кебича готовило карточки для населения, чтобы в условиях галопирующего роста цен защищить труженика. Чтобы кроме зарплаты в советских рублях он мог за карточки купить определенное количество дешевого хлеба, молока, мяса. И вот когда Россия выпустила свой рубль, Кебич принял совместное с Нацбанком постановление о введении «зайчика».

Один «зайчик» приравнивался к 10 советским рублям. Поначалу он ходил одновременно с советскими деньгами, что приводило к путанице, однако эта мера была вынужденной: «зайчиков» просто не хватало. Но, даже выпустив «зайчики», правительство считало, что своей валюты у нас нет. Формально мы объявили, что у нас есть своя национальная валюта, когда Нацбанк административно установил курс к российскому рублю.

– Выиграв выборы летом 1994 года, Лукашенко как к вам стал относиться?

– После победы на выборах он прислал за мной машину на дачу. Тому, кто приехал, я сказал: сообщи Лукашенко, что не нашел меня.

Утром Лукашенко снова прислал машину. На встрече была такая фраза: давайте, Станислав Антонович, забудем, что вы кое-кого назвали кукарекой, а я вас чиновником, давайте вместе работать, разработайте с другими специалистами программу первоочередных мер.

[illegible]

– Как вы пришли к отставке?

– Среди журналистов распространено мнение, будто Лукашенко снял меня с должности. Это не совсем правда. Моей отставке предшествовало несколько эпизодов.

Поехали мы с Лукашенко на Камвольный комбинат, который тогда "лежал". Реализация тканей была нулевой, и люди не получали зарплату, на предприятии [illegible]. Мы походили по территории, он посовещал. Потом на итоговом совещании Лукашенко обратился ко мне: надо немедленно выделить им кредит – на производство и зарплату. Мой ответ был такой: Александр Григорьевич, нет вопросов, найдем средства, но они прежде должны предоставить бизнес-план – как они будут выходить из кризиса. Он промолчал.

Проходит время, никто мне никаких планов не несет. А потом я узнаю: Лукашенко вызвал к себе руководителя «Сбербанка» Хилько и дал ему команду: иди и переведи им деньги. Тот распоряжение немедленно выполнил.

После этого организовывается конференция в Гродно по экономике. Я подготовил критическое выступление о том, что программа первоочередных мер не выполняется. Но внезапно меня пригласили в Вашингтон для решения вопроса о выделении кредита стэнд-бай. И я попросил своего помощника Дашкевича выступить на конференции с изложением моего доклада. Прилетаю домой, Лукашенко мне заявляет: мы в одной лодке, ты мог думать что угодно, но ты не имел права публично критиковать правительство и наши решения.

Третий эпизод. По закону всякие объединения банков могли производиться только с согласия Нацбанка. Лукашенко внезапно решил объединить государственный «Сбербанк» с убыточным частным «Беларусбанком», который тогда возглавляла Винникова. Я выступил категорически против, но он все равно выдал указ об объединении. С учетом предыдущих игнорирований моего мнения я написал заявление об отставке.

Но и после этого Лукашенко не захотел меня отпускать. В мою защиту пошли к нему и Чигирь, и Синицын, и Долгалев. Тогда Лукашенко решил [illegible]

[illegible] Винникова заявила, что Богданкевич к ней придирается. Я ответил: коммерческий «Беларусбанк» имеет убытки, автомобили и оборудование покупает не за счет прибыли, а за счет вкладчиков, а теперь хочет заткнуть дыры за счет государственного «Сбербанка». [illegible]

[illegible] И Лукашенко подписал мое заявление об отставке.

[illegible] заявление [illegible] менту? [illegible] и туда.

– Лукашенко обращался к вам, как и к остальным, на «ты»?

– Никогда. И никогда не повышал на меня голоса. [illegible]

Более того, уже спустя много лет, в 2000-х, в Минске проходила программа «Свобода слова» [illegible] И меня [illegible] пригласили на [illegible] Я отказался, [illegible] мои близкие [illegible] Виктор Гончар и Юрий Захаренко. Как я пойду к нему, если убежден, что его вина [illegible] была?

– Кого из управленцев той эпохи вы уважали?

– Я считаю, что Мясникович был хорошим администратором. Мы совместно с ним подписывали в Вашингтоне [illegible] соглашения с [illegible] Европейским банком. [illegible] человек [illegible] административно-командной формации. Но у него все было под контролем. На совещаниях [illegible] все поручения [illegible] по фамилиям [illegible] фиксировались. В условиях ручного управления он был на своем месте.

Однако затем, будучи во главе Администрации президента и правительства, он ничего существенного не сделал. Как был исполнителем, так им и остался.

– Как теперешнего премьера Кобякова оцениваете?

– Считаю, что это человек советской формации. [illegible]

Кобяков сегодня ничего нового не предлагает! [illegible]

– Станислав Антонович, вы прямолинейный человек. Вам в жизни это мешало?

[illegible]

– Вам – 78, а младшему сыну – 19. Контакт находите?

[illegible]

Руслан ГОРБАЧЕВ.

ЛЁС ЧАЛАВЕКА

Беларускі рыцар украінскага Майдана: герой – ва Украіне, бандэравец – у Беларусі



«Мішка, Мішка, хто ж табе даў права мяне пакінуць? Я табе такога права не давала...» Маці палеглага героя Майдана Ніна Васільеўна Жызнеўская горка ўсхліпвае, выцірае хусцінкай слёзы.









Вянкі, жывыя кветкі, памінальныя свечкі. Вянкамі застаўлена ўся магіла. Адзін з іх – побач з крыжам, абвітым вялікім блакітна-жоўтым палотнішчам. Пад ім партрэт Мішкі – Міхаіла Міхайлавіча Жызнеўскага, 25-гадовага гамяльчаніна, забітага 22 студзеня 2014 года стрэлам у сэрца на вуліцы Грушэўскага ў Кіеве падчас Рэвалюцыі годнасці і справядлівасці. Да свайго чарговага дня народзінаў Міша не дажыў чатыры дні.

Авальныя абрысы твару, крыху прыжмураны позірк, светлыя стрыжаныя валасы і лёгкая ўсмешка. Уражанне такое, што Жызнеўскі ведае тое, чаго не кожнаму дадзена спасцігнуць у жыцці. А і праўда: Міша загінуў за свабоду братняга ўкраінскага народа. Як гэта там пра гераізм і самаахвярнасць: герой – гэта той, хто ў вырашальны момант робіць тое, што неабходна ў інтарэсах чалавецтва.

У вырашальны для Украіны момант беларус Міхаіл Жызнеўскі, які жыў апошнія сем гадоў у Белай Царкве, быў на барыкадах Еўрамайдана ў Кіеве.

Год таму Мішу прывезлі на Гомельшчыну і пахавалі на радавых могілках у вёсцы Сцяг Працы, паблізу абласнога цэнтра. Да перайменавання вёска называлася Абрэзы – гэта радзіма маці Міхаіла. Дзяцінства Мішы, па сутнасці, тут і праходзіла.

У высокіх соснах, што растуць на вясковым пагосце, гуляе прылагоджаны адлігай вецер, гайдае вяршаліны. Ад гора хістаецца і Ніна Жызнеўская, не знаходзячы адказу на мацярынскае пытанне: «Мішка, Мішка, хто ж табе даў права мяне пакінуць?»

Ніна Васільеўна расказвае журналістам і ўсім, хто прыехаў, каб ушанаваць памяць Міхаіла Жызнеўскага з Кіева, Мінска, Гомеля, што час, які сям'я пражыла без яго, як у тумане, – яна сама, бацька Міхаіл Пятровіч, сястра Наташа. А прыязджаюць на магілу – і яшчэ больш засмучаюцца: невядомыя вандалы зрываюць блакітна-жоўтыя сцяжкі, разразаюць жалобныя стужкі на вянках і кошыках.

Распалавіненую стужку з надпісам «Герою Нябеснай Сотні ад харкаўчан» бацькі знайшлі кінутай за дзясяткі метраў ад магілы сына, падабралі і прымацавалі назад да жалобнага кошыка з Харкава. Гэтак было і са сцягам.

«Такая боль бярэ і крыўда, – кажа маці героя, – калі прыязджаеш сюды, на могілкі, і бачыш, што за брыдоту тут робяць. Разумееце, проста няма слоў. І хто гэта робіць? Гэта толькі нашы, мясцовыя, мабыць, навучаныя і падбухтораныя. Вось гэты вялікі ўкраінскі сцяг мы знайшлі бог ведае дзе. Я папрасіла Алёшу: прымацуй так, каб не сарвалі. Лёша яго так закруціў, што застаецца толькі парваць на кавалкі».

І гэтак – пастанна: «Маленькіх сцяжкоў было 12 штук – ацалелі толькі два. Міша нікому з беларусаў нічога кепскага не зрабіў, нікога не пакрыўдзіў, не стукнуў. Чаму так ставяцца да магілы? Правільна, Міша цяпер не можа за сябе заступіцца, сябе абараніць. Дык што – можна такое рабіць?»

Жызнеўская наважылася ўжо прасіць дапамогі ва ўкраінскага прэзідэнта Пятра Парашэнкі. Акурат падчас уручэння бацькам Мішавага ордэна Героя Нябеснай Сотні ў Кіеве ўкраінскі лідар прапанаваў ім звяртацца да яго пры любой патрэбе.

«Былі тут, на могілках, з украінскай амбасады, – гаворыць Жызнеўская. – Я ім пра ўсё гэта распавяла. Яны запэўнілі, што будуць звязвацца з Аляксандрам Лукашэнкам, з мясцовай уладай. Сама я буду дамагацца выхаду на Пятра Парашэнку, каб Украіна дапамагла мне абараніць магілу сына. Па-іншаму не атрымліваецца. Бо ўсё тут разваляць, разбураць. Тым больш што нашы беларусы збіраюць сродкі на помнік Мішу. Што з ім станецца – я і думаць баюся».

Пра неадэкватную рэакцыю некаторых беларусаў на імя сына, пра стаўленне да магілы Ніна Васільеўна з мужам распавялі ўжо непасрэдна прэзідэнту Украіны, калі той прымаў іх у мінулым лістападзе ў сваёй рэзідэнцыі.

Парашэнка тады, па словах Ніны Жызнеўскай, сказаў ім: «Калі хочаце, я патэлефаную Лукашэнку і пагутару з ім на гэтую тэму, каб не чапалі магілу Мішы». Але бацькі, ведаючы, што ў кіраўніка ўкраінскай дзяржавы і без таго спраў хапае, толькі падзякавалі: можа, неяк справімся.

Аказалася, украінскі прэзідэнт асабіста ведаў Мішу Жызнеўскага, выказваўся пра яго як пра сумленнага і справядлівага хлопца. Нават назваў яго «міратворцам», бо Міша на барыкадах усё імкнуўся вырашыць мірным шляхам. Прэзідэнт запэўніў бацькоў загінуўшага беларуса, што будзе імкнуцца, каб Вярхоўная Рада ўнесла змены ў заканадаўства. У такім разе найвышэйшым званнем – Герой Украіны – можна будзе ўганараваць і не грамадзян Украіны, якія загінулі на Майдане: беларуса Міхаіла Жызнеўскага, грузінаў Зураба Хурція, Давіда Кіпіяні.

Бацька Жызнеўскага, Міхаіл Пятровіч, згадвае, што пасля сустрэчы ён адчуў яшчэ больш гонар за сына. І не толькі за яго.

«Я адчуў гонар за сына. Адчуў гонар і за Беларусь, дзе вырас такі герой. Ён ахвяраваў жыццё за свабоду Украіны. Для Мішы Украіна стала другой радзімай, і сын не саромеўся пра гэта казаць», – адзначае Міхаіл Пятровіч.

Бацька дадае, што з расповедаў камандзіра сотні, у якой Міша змагаўся на Майдане, з відэазапісаў у інтэрнэце бачна, што сын не быў агрэсіўны: «Ён заўсёды імкнуўся развесці любы канфлікт без абвастрэння. Я і сам не цярплю канфліктных сітуацый – стараюся вырашаць усё мірным шляхам. Пры гэтым наш Міша быў спартсменам, займаўся шмат гадоў каратэ – мог любому завадатару даць здачы, даць адпор. Калі ён у шэрагах самаабароны дзяжурыў на барыкадах – альбо нават не дзяжурыў, – і калі ўсчынаўся які канфлікт, заўсёды клікалі Мішу. Бо ён мог лепей за ўсіх вырашаць канфлікты».

Развіталіся з героямі Майдана дзясяткі тысяч кіяўлян. У руках – столькі ж дрыготкіх знічоў. І над людскім морам – шчымлівая да болю ўкраінская песня: «Гей, пливе кача по Тисині», – якую дужа любіў Міша Жызнеўскі.

«Мне тады падалося, – прыгадвае Жызнеўскі-бацька, – што ўвесь Кіеў выйшаў развітацца з Мішам, усімі іншымі змагарамі, палеглымі на барыкадах».

На вуліцы Грушэўскага ў Кіеве паставілі помнік беларускаму герою Майдана. Жызнеўскіх запрасілі прыехаць у сталіцу Украіны. Акурат на ўрачыстасці Ніна Васільеўна праз тэлебачанне звярнулася да ўкраінскага прэзідэнта. І ён пачуў маці героя, запрасіў праз памочнікаў у рэзідэнцыю.

У Гомелі ж улады ніяк не выявілі свайго стаўлення да гібелі Міхаіла Жызнеўскага – не выказалі сям'і ні спагады, ні спачування. Толькі маладыя беларусы з ліку грамадскіх актывістаў, зазначае Жызнеўскі-бацька, надзвычай паважліва паставіліся да памяці Міхаіла: «Прыязджаюць да яго на магілу з розных гарадоў, прывозяць кветкі. І нам, бацькам, дзякуюць за такога сына. Ён загінуў за свабоду не толькі Украіны, але і Беларусі».

Гомельская настаўніца і спявачка Вальжына Цярэшчанка тлумачыць, што не магла не прыйсці на гадавіну памяці Міхаіла.

«Ганаруся, што ён мой зямляк. Ён, вядома, мог бы жыць ды жыць. Міша здзейсніў подзвіг. Ён быў супраць бязладдзя, калі чалавек прыціснуты да сцяны і не ведае, як абараніцца, куды звярнуцца. Таму і паўстала Украіна, утварыўся Майдан. І Міша быў там – і загінуў. Хтосьці абараняе правы, а хтосьці – забівае іншых. Міша варты вечнай памяці, варты быць прыкладам для сучаснай моладзі. Вечная памяць майму земляку, слаўнаму хлопцу – Мішу Жызнеўскаму», – кажа Вальжына.

Жызнеўскія – Ніна Васільеўна, Міхаіл Пятровіч з дачкою Наташай – толькі што перасяліліся з найманай кватэры на вуліцы Севастопальскай ва ўласную двухпакаёўку, набытую на дапамогу ўкраінскага ўрада і тамтэйшых дабрачынных фондаў. Гэта недалёка ад ранейшага шматпавярхоўніка, і таксама на першым паверсе.

І тут на табе – чарговае ўзрушэнне, абраза. Ніна Васільеўна з прычыны кепскага стану здароўя рэдка выходзіць з дому, часцей адчыняе акно, каб падыхаць свежым паветрам. Так было і 5 лютага.

«Я зайшла ў Наташын пакой і адчыніла акно падыхаць паветрам. Нейкі мужык, яшчэ не стары, гадоў так 38–40, стаіць пад вокнамі, паліць і нахабна мне ў твар кажа: "Ну што, бандэраўская с...ка, яшчэ мы вас тут не дарэзалі. Каго ты нарадзіла – бандыта?!" Так мне ў твар і кажа. І разумееце, проста ў акно плюе», – хвалюецца Ніна Васільеўна.

Жанчына кажа, што ніколі брыдка не лаялася, а тут – адказала, ды так, што нахабнік ажно сумеўся: «Я ніколі ў жыцці не мацюкалася, ніколі. А тут я выказалася, бо мне стала так крыўдна і балюча, што не стрымалася. Ты ж, думаю, не ведаеш ні сітуацыі, ні нас – і так абражаеш. Добра, мяне ты абразіў. А пры чым тут мой сын? Ты ж яго не ведаў, не бачыў, што ён з сябе ўяўляе».

Жызнеўская мяркуе, што незнаёмец мог быць са шматпавярхоўніка на Севастопальскай, дзе яны наймалі кватэру і дзе некаторыя жыльцы адразу пасля смерці Мішы абражалі яе падобным чынам, называючы загінуўшага сына то «бандытам», то «нацыстам».

